Голас Радзімы

№ 24 (1750)
17 чэрвеня 1982 г.

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ
(БЕЛАРУСКАЕ ТАВАРЫСТВА «РАДЗІМА»)

Выдаецца з 1955 г.
Цана 4 кап.

Здаецца, няма ў Мінску такой вуліцы, дзе не стаяў бы «дом Громава». Комплексная брыгада Героя Сацыялістычнай Працы, заслужанага будаўніка БССР Аляксандра Громава пабудавала ў беларускай сталіцы тысячы кватэр, дзесяткі дзіцячых садоў і школ, адміністрацыйных і бытавых устаноў.
НА ЗДЫМКУ: Аляксандр ГРОМАЎ з сынам Уладзімірам. [Артыкул пра славутага будаўніка «Громаў — імя вядомае» чытайце на 2—3 стар.].
Фота Ю. ЗАХАРАВА.

падзеі • людзі • факты

НАПЯРЭДАДНІ ВЫБАРАЎ

КАНДЫДАТЫ НАРОДА

20 чэрвеня ў нашай рэспубліцы адбудуцца выбары ў мясцовыя Саветы народных дэпутатаў і народных суддзяў. Быць народным выбраннікам у нас — вялікі гонар і адказнасць, бо Саветам народных дэпутатаў прадастаўлена ўся паўната ўлады па вырашэнню задач сацыяльнага і эканамічнага развіцця грамадства.

Цяпер у Беларусі праходзіць заключны этап падрыхтоўкі да выбараў. На сходах працоўныя рэспублікі вылучаюць сваімі кандыдатамі людзей паважаных, аўтарытэтных, творчых. І ў аснову гэтага палітычнага акта кладзецца ні род, ні знатнасць, ні заможнасць таго ці іншага кандыдата, а арганізатарскія здольнасці, шырокі палітычны кругагляд. Сярод тых, каму аказана высокае давер'е, рабочыя і калгаснікі, вучоныя і воіны, настаўнікі і ўрачы, спецыялісты народнай гаспадаркі, партыйныя, савецкія работнікі, прадстаўнікі ўсіх слаёў насельніцтва, усіх нацый і народнасцей краіны.

Сярод вылучаных кандыдатамі ў дэпутаты Саветаў розных ступеней — людзі вялікага жыццёвага вопыту, якія служаць прыкладам высокасвядомых адносін да сваёй справы, да выканання грамадскага абавязку: гэта машыніст Віцебскага лакаматыўнага дэпо, настаўнік моладзі, Герой Сацыялістычнай Працы, дэлегат XXVI з'езда партыі Яўген Чарвякоў, слесар-інструментальшчык Мінскага трактарнага завода, Герой Сацыялістычнай Працы, член ЦК КПСС Яўген Клімчанка, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР, кавалер ордэнаў Працоўнага Чырвонага Сцяга і «Знак Пашаны» аператар машыннага даення калгаса імя Жданава Брэсцкага раёна Галіна Скакун, тысячы іншых перадавікоў вытворчасці, людзей высокага грамадзянскага абавязку.

ЮБІЛЕІ

ПАМЯЦІ ЯНКІ КУПАЛЫ

Стагоддзе з дня нараджэння Янкі Купалы шырока адзначаецца сёлета ў нашай краіне. 8 чэрвеня ў Маскве адбылося пасяджэнне Усесаюзнага юбілейнага камітэта.

Старшыня камітэта першы сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў СССР Г. Маркаў адзначыў вялікі ўклад слаўнага сына Беларусі ў скарбніцу савецкай культуры, яго плённую грамадскую дзейнасць. Юбілей Янкі Купалы будзе адзначан ўрачыстым пасяджэннем прадстаўнікоў працоўных Масквы з удзелам вядучых савецкіх і замежных літаратараў у Вялікім тэатры СССР.

У гонар знамянальнай даты ва ўсіх саюзных рэспубліках пройдуць літаратурныя вечары, навуковыя і чытацкія канферэнцыі. У Маскве, у Цэнтральным доме літаратараў імя А. Фадзеева, арганізуецца тэматычная выстаўка, прысвечаная жыццю і творчасці паэта.

Міністэрства сувязі СССР выпускае юбілейныя паштовыя маркі, канверты і паштоўкі з партрэтам Янкі Купалы, а Усесаюзная фірма «Мелодыя» выдае пласцінку з запісам яго твораў.

Усе буйнейшыя выдавецтвы краіны азнамяноўць юбілей выпускам святочных выданняў. Трохтомны збор твораў, у які ўваходзяць вершы і публіцыстыка паэта, выпускае выдавецтва «Художественная литература». У серыі «Жыццё выдатных людзей» выдавецтва «Молодая гвардия» выпускае кнігу аб слаўным сыне Беларусі.

РЭСПУБЛІКА ЗА МЯЖОЙ

ЗА МІР І ПРАЦУ

На праходзячай у Жэневе генеральнай канферэнцыі Міжнароднай арганізацыі працы (МАП) разгарнулася агульная дыскусія. У цэнтры ўвагі знаходзяцца пытанні беспрацоўя, асабліва сярод моладзі, а таксама праблемы, звязаныя з пагаршэннем умоў жыцця і працы рабочых у большасці краін Захаду.

Выступаючы на пленарным пасяджэнні, прадстаўнік Беларусі, сакратар Беларускага рэспубліканскага савета прафсаюзаў А. Абуховіч падкрэсліў, што рост творчай актыўнасці членаў прафсаюзаў рэспублікі, павышэнне іх кваліфікацыі і тэхнічнай узброенасці працы ў многім забяспечылі перавыкананне плана эканамічнага і сацыяльнага развіцця БССР у 1981 годзе і тым самым стварылі неабходныя перадумовы для далейшага павышэння дабрабыту народа. Поспехі ў эканамічным і сацыяльным развіцці — гэта таксама вынік брацкай узаемадапамогі і супрацоўніцтва ўсіх народаў нашай краіны, якія адзначаюць сёлета 60-ю гадавіну ўтварэння Саюза ССР. Выраслі рэсурсы і магчымасці і саміх прафсаюзаў для арганізацыі аховы здароўя і адпачынку працоўных, культурна-асветніцкай і выхаваўчай работы.

З ВІЗІТАМ У БЕЛАРУСЬ

ГОСЦІ З БАЛГАРЫІ

У Мінску пабывала дэлегацыя партыйных работнікаў Балгарскай камуністычнай партыі на чале з сакратаром ЦК БКП Васілам Цанавым.

На сустрэчы ў ЦК КП Беларусі, прайшоўшай у таварыскай, сардэчнай абстаноўцы, адбыўся абмен вопытам работы партыйных арганізацый.

Сакратар ЦК КПБ М. Дземянцей расказаў аб дзейнасці партыйнай арганізацыі рэспублікі па рэалізацыі намечаных адзінаццатым пяцігадовым планам рубяжоў прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці, ажыццяўленню Харчовай праграмы СССР, прынятай майскім (1982 г.) Пленумам ЦК КПСС.

Госці з Балгарыі пабывалі таксама ў Магілёўскай вобласці.

КАМУНІСТЫ РУМЫНІІ

12 чэрвеня ў Мінск прыбыла дэлегацыя партыйных работнікаў Румынскай кампартыі, якую ўзначальвае член ЦК РКП, першы намеснік загадчыка аддзела арганізацыйна-партыйнай работы ЦК РКП Іаахім Мога.

Румынскіх камуністаў прыняў другі сакратар ЦК КПБ У. Бровікаў. Адбылася гутарка, якая прайшла ў цёплай, таварыскай абстаноўцы.

Госці з Румыніі наведалі славутыя мясціны Мінска, агледзелі новыя раёны жыллёвага будаўніцтва беларускай сталіцы, зрабілі паездку на мемарыяльны комплекс «Хатынь».

ВЕСТКІ АДУСЮЛЬ

Капустай у саўгасе імя Я. Купалы Маладзечанскага раёна занята каля 140 гектараў. Гароднінаводства прыносіць гаспадарцы вялікі прыбытак.

НА ЗДЫМКУ: пасадка расады капусты машынамі «СКМ-6».

Земляробы калгаса «Савецкая Беларусь» Рэчыцкага раёна мяркуюць сёлета атрымаць на кожныя сто гектараў сельгасугоддзяў па 830 цэнтнераў малака і 280 —мяса. З году ў год ў гаспадарцы дабіваюцца высокай ураджайнасці лугоў і палёў, вырошчваюць выгадныя, багатыя на пажыўныя рэчывы культуры, забяспечваюць жывёлу фуражом, выкарыстоўваюць навукова абгрунтаваныя рацыёны кармлення.
Цяпер механізатары калгаса вядуць міжрадковую апрацоўку кукурузы, скошваюць травы для падкормкі жывёлы.

НА ЗДЫМКУ: нарыхтоўка зялёнага корму ў калгасе.

ПРАФЕСІЯ

СТАЛА СЯМЕЙНАЙ

ГРОМАЎ— ІМЯ ВЯДОМАЕ

Дождж ліў як з вядра. Каб не змокнуць, я ўскочыў у праязджаючы тралейбус. Перасякаючы плошчу імя Леніна, дзе цяпер ідзе будаўніцтва інжынернага корпуса Мінскага метрапалітэна, на ўзводзімай сцяне заўважыў высокую постаць — мужчына стаяў ва ўвесь рост з паднятай уверх рукой і падаваў сігналы кранаўшчыку.

Дзе я бачыў гэтага чалавека? Я быў упэўнены, што ведаю яго. Праз гадзіны тры, калі перабіраў здымкі, дасланыя ў рэдакцыю, убачыў знаёмую постаць. Сумнення не было: на будаўнічай пляцоўцы стаяў Герой Сацыялістычнай Працы, заслужаны будаўнік БССР Аляксандр Громаў.

— Чаму ж ад дажджу не хаваліся? — нагадаў я Аляксандру Мацвеевічу ў час сустрэчы той выпадак.

А ён мне кажа:

— Дзе ж ты бачыў такога будаўніка, які б ад дажджу хаваўся?..

І сапраўды. Нялёгкая прафесія будаўніка. І зімой, і летам — усё пад адкрытым небам.

Але Аляксандр Мацвеевіч не шкадуе, што абраў іменна гэту прафесію, хаця і не марыў аб ёй — так распарадзіўся лёс.

У Кузьмінічах, што па Гомельшчыне, аб Громавых гаварылі з павагай: глыбока ў зямлю пусцілі карані. Спрадвеку былі добрымі хлебаробамі і хлебасольнымі гаспадарамі. Рыхтаваўся і Аляксадр пайсці на сцяжынцы дзеда і бацькі. Любіў устаць да дня і ўзяцца за касу, пахадзіць за плугам...

Усё змяніла вайна. Давялося Аляксандру Громаву прайсці з баямі Літву, Латвію, Эстонію. Вызваляў Польшчу, удзельнічаў у штурме Берліна. Гэты нялёгкі шлях франтавіка адзначаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі.

— З болем у сэрцы глядзеў я на разбураныя вайной гарады, — расказвае Громаў. — Асабліва ўразілі руіны Мінска, куды я прыехаў пасля дэмабілізацыі. Многія франтавікі засталіся адбудоўваць горад. Застаўся і я. Абраў прафесію муляра.

Цяжка працавалася тады. Не было дзе жыць, не хапала прадуктаў. Кожную цаглінку пры-

РЫХТУЕМ ДА ЖЫЦЦЯ РУПНЫХ ГАСПАДАРОЎ

ЛЕТНІЯ ЎРОКІ ПРАЦЫ

Калі на Захадзе заходзіць размова аб нашых школьных летніх лагерах працы і адпачынку, там нібы і прызнаюць, што ў сваёй аснове гэта мае здаровы пачатак: падлетак павінен вучыцца не толькі за партай у класе, але і ў полі, у майстэрні, на доследным участку. Але тут жа пачынаюць крывадушна ўздыхаць: кіраўнікі гаспадарак, маўляў, эксплуатуюць працу падлеткаў, прыкрываючы сваю дзейнасць размовамі пра выхаваўчае значэнне працы і г. д.

Ну што можна сказаць у адказ на такую прапагандысцкую хлусню! Нашы школьныя лагеры працы і адпачынку — гэта сапраўдная школа жыцця для падлеткаў, дзе іх прывучаюць любіць сваю зямлю, рупліва гаспадарыць на ёй, сучаць розным сельскагаспадарчым прафесіям.

Як гэты працэс адбываецца, у якіх умовах працуюць дзеці, і пойдзе гаворка ў артыкуле, які сёння мы прапануем чытачам «Голасу Радзімы».

* * *

Дабротны двухпавярховы будынак. У пакоях чыста і ўтульна. Ложкі засланы свежай бялізнай, многа кветак. Побач — пакой для гульняў, кіназала, сталовая. Так выглядае лагер працы і адпачынку «Рытм» Камянецкай сярэдняй школы. Размешчаны ён у калгасе «Радзіма». Тут дзеці праходзяць свае летнія ўрокі працы, каб ведаць, што такое жыццё, і быць падрыхтаванымі да яго.

Праўленне калгаса і адміністрацыя школы стварылі ўсе ўмовы, каб праца падлеткаў была творчай, а адпачынак — вясёлым і карысным. Дастаткова сказаць, што толькі на рамонт будынка лагера калгас затраціў 12 тысяч рублёў. Усё абсталяванне — таксама за яго сродкі. Ну, а пра адпачынак старшакласнікі паклапаціліся самі. Стварылі аператыўны штаб, які кіруе ўсёй вытворчай і выхаваўчай работай. Гурткі вязання, танцавальны, вакальны, мастацкага чытання, выяўленчага мастацтва, секцыі валейбола, футбола, бадмінтона, плавання — ўсё гэта ёсць у лагеры. Прычым кіруюць імі самі вучні.

Традыцыйнымі сталі ў «Рытме» канцэрты мастацкай самадзейнасці, з якімі выступаюць дзеці перад вяскоўцамі. А летась яны пачалі збіраць матэрыялы аб сваім падшэфным калгасе «Радзіма», каб добра ведаць гісторыю гаспадаркі, людзей —патомных сялян, якія працуюць на гэтай зямлі, глыбей пазнаёміцца з высакароднай прафесіяй хлебароба.

Такіх лагераў, як «Рытм», у цэлым, у рэспубліцы сёлета працуе 1600. Ствараюцца яны, як правіла, на базе сельскіх агульнаадукацыйных школ. Ёсць нават спецыяльнае Палажэнне аб лагерах працы і адпачынку, у якім выкладзены іх мэты і задачы. Мэта, вядома, адна — выхаваць маладое пакаленне не толькі адукаваным, але і працавітым. Разам з тым дапамагчы падлеткам з'арыентавацца ў выбары прафесіі. Таму старшакласнікі едуць на лета ў калгасы і саўгасы вельмі ахвотна. Працуюць яны не больш чатырох гадзін, астатні час — адпачываюць.

Заробленыя грошы, за невялікім вылічэннем на харчаванне, дзецям выплачваюцца на рукі. Гэта таксама іх падахвочвае. Каму не прыемна набыць потым нейкую рэч не на бацькавы грошы, а на ўласныя, заробленыя сваім мазалём.

У большасці выпадкаў школьнікі знаходзяцца ў лагерах працы і адпачынку за кошт калгасаў і саўгасаў. У Хойніцкім раёне Гомельскай вобласці, напрыклад, усе гаспадаркі поўнасцю нясуць расходы за харчаванне, а старшакласнікі зарабляюць за змену па 80—100 і больш рублёў.

За апошнія гады паляпшаецца быт і адпачынак у лагерах. Прадпрыемствы, калгасы і саўгасы сталі будаваць больш зручныя і камфартабельныя стацыянарныя лагеры працы і адпачынку. Летась працаваў 161 такі лагер, а к канцу адзінаццатай пяцігодкі будзе пабудавана яшчэ 174.

Лагеры працы і адпачынку заваявалі не толькі вялікую папулярнасць, але і даказалі сваю эфектыўнасць у працоў-

ходзілася надымаць па плячах па рыштаваннях на наверхі. Адзін дом будавалі тры гады. А цяпер за тры месяцы вунь якая махіна вырастае. Усе працэсы механізаваны.

Громаў і яго комплексная брыгада ўзводзілі жылыя дамы ў раёне былой Камароўкі, політэхнічны інстытут на Ленінскім праспекце, будынкі ў Зялёным Лузе і па Ангарскай... Здаецца, няма такой вуліцы ў нашай сталіцы, дзе не стаяў бы «дом Громава».

Адпойчы ў складзе турысцкай групы Аляксандр Мацвеевіч наведаў ЗША. У Чыкага адбылася гутарка з амерыканскім рабочым, які спытаў у нашага земляка:

— Вы, містэр Громаў, вялікі вучоны, прафесар?

За Аляксандра Мацвеевіча адказаў адзін з членаў савецкай турысцкай групы:

— Так, прафесар. Яшчэ які прафесар у сваёй справе.

Амерыканец задаў другое пытанне:

— Напэўна, вы багаты чалавек?

І зноў жа таварыш Громава адказаў:

— У Мінску на рахунку Аляксандра Громава тысячы кватэр, дзесяткі дзіцячых садоў, школ, адміністрацыйных і бытавых збудаванняў.

Аляксандр Громаў двойчы пабываў у ГДР, з'ездзіў у В'етнам, Чэхаславакію, Польшчу. Усе паездкі — узнагарода за выдатную працу.

За трыццаць з лішнім працоўных гадоў Громаў падрыхтаваў дзесяткі вучняў. Многія з іх, такія, як Генадзь Карэцкі, Антон Ліхадзіеўскі, працуюць побач. Аб іх з павагай гавораць: «Громаўскай загартоўкі людзі. Кіпіць справа ў іх руках».

Прыемна чуць такія словы Аляксандру Мацвеевічу. Але работа з людзьмі, лічыць ён, больш цяжкая і складаная, чым узвядзенне сцен любога будынка. Гэта толькі здаецца, што кожны, хто прыходзіць на будоўлю і трапляе да вопытнага настаўніка становіцца добрым спецыялістам. Здараецца, што сам Аляксандр Громаў раіць маладому будаўніку памяняць прафесію, знайсці работу па сваіх здольнасцях.

Строгім настаўнікам быў Аляксандр Громаў і для сваіх сыноў, калі тыя вырашылі пайсці ў бацькаў след. Затое цяпер ён спакойны за іх: і Валодзя, і Генадзь абралі справу па душы. Уладзімір Громаў — прараб, працуе разам з бацькам, у тым жа будаўнічым упраўленні. Генадзь таксама стаў будаўніком.

Радуецца бацька, што яго прафесія стала сямейнай.

Яўген ТУРАЙКЕВІЧ.

ГІСТОРЫЯ АДНОЙ КАР'ЕРЫ

ЁН ВЫБРАЎ БЕЛАРУСЬ

У кожнай савецкай рэспубліцы, літаральна ў кожным куточку неабсяжнага Савецкага Саюза можна сустрэць прадстаўнікоў самых розных народаў нашай краіны. Пэўны час мне давялося жыць у Комі АССР. Побач са мной працавалі не толькі карэнныя жыхары рэспублікі, але і рускія, і грузіны, і літоўцы, і бураты. Мы жылі дружнай сям'ёй.

Шмат прадстаўнікоў розных народаў СССР жыве і на Беларусі. Мноства жыццёвых дарог прыводзіць іх да нас. Часам гэта выпадак: прыехаў чалавек папрацаваць, вучыцца і застаўся назаўсёды. Але часцей дарога на Беларусь абіраецца свядома. Менавіта так паступіў Алег Сігаеў, ураджэнец Браншчыны.

У 1955 годзе, калі ён закончыў Бежыцкі (цяпер Бранскі) інстытут транспартнага машынабудавання, нашай рэспубліцы, як і ўвогуле ўсёй краіне, патрэбны былі кадры спецыялістаў-машынабудаўнікоў. У той час толькі што закончылася аднаўленне Мінскага аўтазавода, працягвалася адраджэнне зруйнаванага ў гады вайны Мінска.

Выпускнік Бежыцкага інстытута трансмашбудавання Алег Сігаеў мог ехаць працаваць бадай што ў любы горад СССР — яму ў ліку лепшых выпускнікоў было дадзена права выбару. І ён выбраў Беларусь, Мінск. Чаму? «Беларусы, згадвае Алег Андрэевіч, уяўляліся мне гераічным, незвычайным народам. Я шмат чытаў і чуў пра подзвіг рэспублікі ў гады ліхалецця. І ўжо тады палюбіў яе ўсім сэрцам».

Маладога інжынера прызначаюць тэхнолагам у ліцейны цэх коўкага чыгуну Мінскага аўтазавода, а праз год, заўважыўшы ў ім выдатныя арганізатарскія здольнасці, пераводзяць непасрэдна на вытворчасць — старшым майстрам у тым самым цэху. Праз шэсць гадоў, у 1962, ён ужо намеснік начальніка цэха, а яшчэ праз сем гадоў — начальнік. У 1971 годзе Алега Сігаева вылучаюць на пасаду намесніка галоўнага металурга завода (Мінскі аўтазавод — адзін з буйнейшых у краіне), на якой ён працаваў да ліпеня 1973 года, да таго, як узначаліў завод ацяпляльнага абсталявання. Здавалася б, сухія даты. Але яны гавораць пра многае: і пра арганізатарскі талент Алега Андрэевіча, і пра яго працавітасць, і, вядома ж, трохі пра шанцаванне.

Размаўляючы з Алегам Андрэевічам, я запытаўся ў яго, як ён успрымае тое, што яму, прыехаўшаму з Расійскай Федэрацыі, так пашанцавала на Беларусі. У адказ Алег Сігаеў шчыра здзівіўся:

— Дык гэта ж зусім натуральна. Права на пасаду зусім не залежыць ад таго, рускі ты ці беларус, грузін ці эстонец. Галоўнае, каб чалавек адпавядаў ёй. Так што факт маёй кар'еры — усяго толькі адзін з многіх.

Вось ужо амаль дзевяць гадоў узначальвае Алег Андрэевіч прадпрыемства. За гэты час Мінскі завод ацяпляльнага абсталявання выйшаў у перадавыя ў сваёй галіне не толькі ў Беларусі, але і ва ўсім Савецкім Саюзе. Завод з IV квартала 1973 года нязменна трымае пераходны Чырвоны сцяг Міністэрства прамысловых будаўнічых матэрыялаў СССР, пяць апошніх гадоў запар заваёўвае пераходны сцяг ЦК КПСС, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ за перамогу ў сацыялістычным спаборніцтве, прадпрыемства занесена на Усесаюзную дошку гонару. Вядома, гэты велізарны поспех — заслуга ўсяго працоўнага калектыву. І ўсё-такі вялікі ўклад у яе — дырэктара. І гэта таму, што дырэктар—першая асоба на прадпрыемстве. Ён першы ва ўсім: і як арганізатар працоўнага працэсу, і як спецыяліст, і як руплівы чалавек. Пра гэта красамоўна сведчыць і паважлівае стаўленне да яго калег па рабоце, і яго вялікі аўтарытэт у Фрунзенскім раёне беларускай сталіцы, на тэрыторыі якога знаходзіцца завод. Алег Андрэевіч з'яўляецца

дэпутатам Мінскага гарсавета, членам бюро Фрунзенскага райкома партыі.

Зайздросны жыццёвы лёс у Алега Сігаева. І павучальны. Алег Андрэевіч на сцежку абранай спецыяльнасці ступіў не выпадкова. У свой час па ёй ішлі яго дзед і бацька — бранскія машынабудаўнікі. Ад іх унуку і сыну перадалася любоў да прафесіі, вернасць ёй, працавітасць.

Дарэчы, на Алегу дынастыя Сігаевых-машынабудаўнікоў не заканчваецца. Прыкладу бацькі следуюць два яго сыны. Старэйшы Валянцін працуе майстрам у ліцейным цэху завода ацяпляльнага абсталявання, малодшы Ігар сёлета закончыў Беларускі політэхнічны інстытут і атрымаў накіраванне на Магілёўскі аўтазавод.

27 гадоў жыве Алег Сігаеў на Беларусі. «Ведаеце, для мяне Беларусь — сапраўдная радзіма,— гаворыць Алег Андрэевіч.— Для сыноў таксама. Яны тут нарадзіліся, выраслі... Ды і сам я тут быццам перарадзіўся — абеларусіўся. Цяпер не ўяўляю свайго жыцця без Мінска. Нават бываючы на адпачынку на Браншчыне, сумую па Беларусі. Толькі ў Мінску я адчуваю сябе сапраўды шчаслівым. Вельмі люблю беларускія песні, беларускую прыроду... Мо гэта здасца і дзіўным, але, хоць я і рускі, мае любімыя пісьменнікі — Янка Купала, Якуб Колас, Іван Шамякін».

Алесь ЛАВЕЦКІ.

Больш трох з палавінай тысяч юнакоў і дзяўчат з гарадоў і вёсак Беларусі вучацца ў Віцебскім педагагічным інстытуце, які нядаўна адзначыў сваё шасцідзесяцігоддзе. Тут створаны ўсе ўмовы для вучобы і адпачынку моладзі.

НА ЗДЫМКАХ: лабараторную работу выконваюць студэнты другога курса фізічнага факультэта Ю. МАЦКЕВІЧ, Н. КУРАШ, А. РАЗВАДОЎСКІ; студэнты чацвёртага курса фізічнага факультэта М. РАЛАВЕЦ і В. ДЗЮБАШЫНСКІ ў абсерваторыі інстытута рыхтуюць тэлескоп да назірання за планетамі.

Фота Л. ПЯТРОВА.

ным выхаванні і прафесійнай арыентацыі.

Адным з асноўных відаў летняй працы для сельскіх школьнікаў у нас сталі вучнёўскія вытворчыя брыгады. Яны ёсць ва ўсіх сярэдніх школах на вёсцы, а таксама ў асобных гарадскіх.

У апошнія гады калгасы і саўгасы замацавалі за вучнёўскімі вытворчымі брыгадамі больш за 17 тысяч гектараў зямлі, сады, выдзелілі неабходную тэхніку, забяспечваюць угнаеннямі, насеннем, пасадачным матэрыялам. Усё, як у дарослых, толькі пад наглядам кваліфікаваных рабочых-настаўнікаў школьнай моладзі. Тут юнакі і дзяўчаты выконваюць вучэбныя заданні, атрыманыя імі па многіх вусных дысцыплінах, набываюць і ўдасканальваюць практычныя навыкі — працуюць памочнікамі трактарыстаў, камбайнераў, майстрамі машыннага даення, паляводамі.

У брыгадах удасканальваецца ўзровень агратэхнічнай вучобы, вядзецца доследная работа з сельскагаспадарчымі культурамі. Больш адной тысячы такіх калектываў працуюць па заданнях вучоных навукова-даследчых інстытутаў, доследных станцый, спецыялістаў калгасаў і саўгасаў. Вынік — школьнікамі пастаўлена больш сямі тысяч доследаў.

Вучнёўская вытворчая брыгада працуе круглы год, дзеці выконваюць увесь цыкл работ — ад пасеву да ўборкі ўраджаю. Зімой рыхтуюць да сяўбы насенне, распрацоўваюць планы работы, тэматыку доследаў, арганізуюць агратэхнічную вучобу. Летам працуюць у брыгадзе згодна з вытворчым планам, але зноў жа не больш 4—5 гадзін у дзень на працягу 24 дзён. У астатнія дні канікул школьнікі адпачываюць, дапамагаюць бацькам у асабістай гаспадарцы, а пры жаданні могуць працягваць працаваць у лагеры.

Каб было больш зразумелым, раскажу пра вучнёўскую вытворчую брыгаду Малоткавіцкай сярэдняй школы. Гэта ў Пінскім раёне на Брэстчыне. Існуе яна ўжо звыш 20 гадоў. Тут склаліся свае традыцыі, умацаваліся сувязі з саўгасам «Малоткавічы», калгасам «Іскра», раённым аб'яднаннем «Дзяржсельгастэхніка», навукова-даследчым інстытутам воднай гаспадаркі. З дапамогай шэфаў у школе пабудаваны майстэрні, цяпліцы, парніковая гаспадарка. Саўгас перадаў школе новыя збожжаўборачныя камбайны «Ніва», «Колас», трактар Т-40 з камплектам сельскагаспадарчых машын. Старшакласнікі з вялікай цікавасцю і ахвотай працуюць побач з вопытнымі спецыялістамі на камбайнах і трактарах, рамантуюць тэхніку.

Эфектыўнай формай далучэння школьнікаў да грамадска карыснай працы сталі школьныя лясніцтвы. Толькі летась імі пасаджана 6 тысяч гектараў лесу, 16 тысяч ачышчана, сабрана 12,6 тоны насення дрэў і кустоў, нарыхтавана шмат лекавых траў, грыбоў, ягад. Работа ў школьных лясніцтвах вельмі вабіць дзяцей. Яны пазнаюць прыроду нашага краю, даведваюцца шмат цікавага пра лясных насельнікаў, вучацца берагчы і ахоўваць навакольнае асяроддзе.

Вось узяць да прыкладу лясніцтва Дамжарэцкай сярэдняй школы на Брэстчыне. Арганізавана яно ў 1973 годзе. Кіруе лясніцтвам настаўніца біялогіі З. Палто. Многа сіл і энергіі аддае яму ляснічы мясцовага лясгаса П. Тынковіч. Асаблівая ўвага ўдзяляецца доследнай рабоце навучэнцаў. Яны вядуць назіранні за колькасцю ападкаў, таўшчынёй снежнага покрыва, тэмпературай паветра і зямлі, вывучаюць тэмпературны рэжым у лесе на працягу сутак, фауну лесу. Круглы год у лесе знойдзецца работа.

А вось вынік такога выхавання: 9 вучняў школы ўжо закончылі лесатэхнічныя навучальныя ўстановы і цяпер працуюць па спецыяльнасці.

Усё большае развіццё атрымліваюць і гарадскія лагеры працы і адпачынку, якія ствараюцца на базе вучэбна-вытворчых камбінатаў. Каля 100 тысяч школьнікаў працавала летам мінулага года ў атрадах па добраўпарадкаванню і азеляненню, 76 тысяч — у рамонтных брыгадах і іншых відах працоўных аб'яднанняў. Тут школьнікі спазнаюць рамантыку працы і яе вартасць, атрымліваюць магчымасць для самасцвярджэння і самавыражэння ў новых для сябе ўмовах, тут аб'ядноўваюцца іх інтарэсы, згуртоўваюцца вучнёўскія калектывы, расшыраюцца веды ў галіне навукі, агульны кругагляд.

У тым, пра што я расказала, няма нічога надзвычайнага. Але, мяркую, што нашаму замежнаму чытачу, а тым болей равеснікам нашых школьнікаў, будзе цікава даведацца і пра гэты бок савецкага ладу жыцця. Мы — грамадства працоўных, таму і маладое пакаленне выхоўваем у вялікай пашане да працы. Ад таго, наколькі падрыхтаваным да свядомай працы ўступіць яно ў самастойнае жыццё, залежыць і кар'ера кожнага, і дабрабыт, і шчасце.

Валянціна ШАЛУХА,
начальнік аддзела пазакласнай і пазашкольнай работы Міністэрства асветы БССР, заслужаная настаўніца БССР.

Выданні «Голасу Радзімы»

YANKA KUPALA, YAKUB KOLAS

SONGS AS CLEAR AS THE SKY



Янка Купала, Якуб Колас... У якой бы краіне ні жыў беларус, гэтыя імёны ён заўсёды вымаўляе з гордасцю. Асабісты і творчы лёс двух вялікіх паэтаў назаўсёды звязаны з лёсам роднага народа. Пройдуць стагоддзі, але ўсё новыя і новыя пакаленні беларусаў з пачуццём глыбокай падзякі будуць чытаць іх творы і праз іх усведамляць, што з'яўляюцца прадстаўнікамі слаўнага, таленавітага і мужнага народа, які ўмее стойка пераносіць цяжкія выпрабаванні, плённа працаваць, спяваць і жартаваць, ветліва сустракаць гасцей. Янка Купала і Якуб Колас былі заснавальнікамі нацыянальнай беларускай літаратуры. І нездарма іх імёны сёння стаяць побач з імёнамі такіх зорак сусветнай літаратуры, як Пушкін, Шаўчэнка, Міцкевіч, Бернс, Уітмен і іншыя.

Сёлета па рашэнню ЮНЕСКА прагрэсіўная грамадскасць у розных краінах свету будзе адзначаць 100-гадовы юбілей двух вялікіх беларускіх паэтаў. Да гэтых падзей рэдакцыя «Голасу Радзімы» падрыхтавала брашуру з перакладамі вершаў Янкі Купалы і Якуба Коласа на англійскую мову.

Брашура названа радком з верша Янкі Купалы «Песні ясныя як неба», які ярка выказвае творчае крэда паэта, мэты, якія ён ставіў перад сабой як грамадскі дзеяч і сапраўдны сын свайго народа.

Брашура дае магчымасць нашым суайчыннікам, якія жывуць у англамоўных краінах, пазнаёміць сваіх дзяцей і ўнукаў, сяброў і знаёмых з творчасцю народных паэтаў Беларусі. Вершы падабраны ў храналагічным парадку, каб чытач мог адчуць разнастайнасць задач, што стаялі перад паэтамі ў розныя перыяды іх творчай дзейнасці, адчуць атмасферу таго знамянальнага для нашага народа часу, калі рушылася старое і ствараласяновае, сацыялістычнае грамадства, развівалася нацыянальная самасвядомасць беларусаў.

Пераклад вершаў Янкі Купалы і Якуба Коласа на англійскую мову зроблены беларускай перакладчыцай Анісіяй Пракоф'евай, якая доўгі час вывучала творчасць паэтаў.

Спадзяёмся, што цікавы нацыянальны матэрыял, лёгкі стыль паэтаў і глыбіня зместу іх вершаў зробяць гэтую брашуру цікавай для самага шырокага кола чытачоў.

Рыгор ФАМЕНКА.

ПЕНСІЯНЕРКА І. ЛАГУНОВІЧ РАСКАЗВАЕ АБ СВАЁЙ ПАЁЗДЦЫ Ў ФРГ

ДОМА ЎЗДЫХНУЛА З ПАЛЁГКАЙ

Да вайны мы жылі ў Ашмянах. Не стану пералічваць усіх нягод, якіх нацярпеліся мы ў час фашысцкай акупацыі. Але я ўдзячна лёсу за тое, што дзень вызвалення сустрэла ўсё ж у родным горадзе.

Іншая доля выпала брату. Яму не споўнілася яшчэ і васемнаццаці, калі ў 1942-м гітлераўцы пагналі яго ў Германію. Доўгія гады мы нічога не ведалі пра яго і лічылі, што страцілі яго назаўсёды. Нарэшце ён падаў вестачку...

Скупыя радкі яго пісем паведамілі нам аб тых мучэннях, якія перанёс за гады фашысцкай няволі мой бедны брат. Здзекі ў лагеры, голад, шаснаццацігадзінная знясільваючая праца падарвалі яго здароўе.

Заканчэнне вайны не прынесла яму свабоды. Яшчэ два гады па міласці амерыканцаў, якія вызвалілі яго, ён знаходзіўся ў тым жа франкфурцкім лагеры для перамешчаных асоб. Розніца была толькі ў тым, што ахова лагера замест фашысцкай стала амерыканскай.

Амаль 40 гадоў жыве мой брат Ян Воўчак у ФРГ. Працаваў на фабрыцы, страціў здароўе задоўга да пенсійнага ўзросту. Больш трэці сваёй маленькай пенсіі брат плаціць за невялікую двухпакаёвую кватэру, а за газ, электрычнасць і іншыя паслугі — асобна.

Нядаўна Ян пабываў у нашых краях. Ні адлегласць, ні час не заглушылі ў ім суму па родных месцах. З якім душэўным хваляваннем, з якім смуткам успамінаў ён далёкія гады бесклапотнага дзяцінства ў бацькоўскім доме, з якім болем гаварыў аб новай разлуцы з роднай зямлёй.

А мінулай зімой я наведала брата ў Франкфурце-на-Майне. Мой пляменнік Эдуард вучыцца ў вышэйшай навучальнай установе. Каб мець і надалей такую магчымасць, ён выконвае любую работу, нават працуе вулічным прыбіральшчыкам. Ён зарабляе сабе на харчаванне, адзенне, падручнікі, плаціць вялікую суму за каморку пад дахам. Стыпендыі студэнты не атрымліваюць. Але самае крыўднае тое, што пасля заканчэння вучобы работу яму ніхто не гарантуе.

У гасцях я захварэла. Сказала пра гэта брату. Ён растлумачыў, што лячэнне ў іх — раскоша, даступная далёка не кожнаму. Каб быць прынятым урачом, трэба быць членам бальнічнай касы, якая вядзе пастаянныя адлічэнні пэўных сум, або ж лячыцца ў прыватніка, што каштуе вельмі вялікія грошы.

Калі брат прыязджаў да мяне, у ашмянскай міліцыі, куды ён прыйшоў адзначыць дакументы, яго спыталі, як ён адпачывае, ці добра сустрэлі яго на роднай зямлі, ці падабаецца яму ў нас.

У франкфурцкім паліцэйскім участку, дзе мне давялося адзначацца па прыездзе, першае пытанне было: «Ці не хочаце вы назаўсёды застацца ў Заходняй Германіі?» І толькі пасля майго катэгарычнага адмаўлення мяне пакінулі ў спакоі. І то не зусім. Усё той жа надакучліва ветлівы паліцэйскі чыноўнік, калі канчаўся мой водпуск, зноў паўтарыў сваё ранейшае пытанне. Я другі раз адмовілася. Тады ён стаў раіць мне пагасціць больш, абяцаючы сваё садзеянне ў надоўжанні маёй візы.

У ФРГ я была ў той час, калі немцы прымалі ў сябе кіраўніка нашай дзяржавы Леаніда Ільіча Брэжнева. Сустрэча была, як гаварылі немцы, на самаму вышэйшаму класу. У Бон з'ехалася ўся працоўная Германія. Праводзіліся грандыёзныя дэманстрацыі ў падтрымку палітыкі Савецкага Саюза, які змагаецца за разрадку міжнароднай напружанасці. Простыя немцы актыўна выступаюць за мір, супраць размяшчэння на сваёй тэрыторыі амерыканскіх ракет. Вядома, ёсць у ФРГ сілы, якім патрэбна гонка ўзбраенняў, халодная вайна, трэба абвастрэнне адносін з сацыялістычнымі краінамі. Я думаю, я ўпэўнена, што ў выніку пераможа справа міру, справа разрадкі.

Пакідаючы Заходнюю Германію, я лёгка ўздыхнула толькі тады, калі ступіла на родную савецкую зямлю. Тут адчуваеш сябе паўнапраўным членам грамадства, якому ты патрэбен і якое яшчэ больш патрэбна табе. Бо ўсё гэта называецца адным цудоўным словам — Радзіма.

І. ЛАГУНОВІЧ,
пенсіянерка.

ДНІ ДРУЖБЫ І САЛІДАРНАСЦІ З АРАБСКІМ НАРОДАМ ПАЛЕСЦІНЫ ПРАЙШЛІ Ў ПАЧАТКУ ЧЭРВЕНЯ Ў БЕЛАРУСІ

ІХ ЗМУСІЛІ ПАЧАЦЬ БАРАЦЬБУ

Грамадскасць рэспублікі цёпла вітала дарагіх гасцей — членаў дэлегацыі Таварыства палесціна-савецкай дружбы. Дэлегацыю прыняў Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Іван Палякоў. Пасланцы палесцінскага народа ўдзельнічалі ў шматлікіх мерапрыемствах Дзён: пабывалі ў працоўных калектывах, на сходах і мітынгах, вечарах дружбы, наведалі Дом-музей І з'езда РСДРП, усклалі вянок да помніка-абеліска на плошчы Перамогі, агледзелі мемарыяльны комплекс Хатынь, сустракаліся з жыхарамі маладога горада беларускіх шахцёраў Салігорска.

— Мы ведаем, якую цану заплаціў ваш народ за свабоду і незалежнасць сваёй Радзімы,— гаварыў на мітынгу дружбы і салідарнасці, што адбыўся ў калгасе «Новы быт» Мінскага раёна, кіраўнік дэлегацыі, член Нацыянальнага Савета Палесціны, член Палітбюро Народнага фронту вызвалення Палесціны, член выканкома Таварыства палесціна-савецкай дружбы Тайсір Куба. — Беларусь страціла больш 2 мільёнаў сваіх сыноў і дачок. 20 мільёнаў савецкіх людзей аддалі свае жыцці ў змаганні з фашызмам. Менавіта фашызм, учыніўшы агрэсію, змусіў ваш міралюбівы народ узяцца за зброю, каб абараніць сваю зямлю, адстаяць свабоду і незалежнасць.

Мы, палесцінцы, — невялікі народ. Мы таксама не хочам вайны. Але сучасныя фашысты — сіяністы Ізраіля— змусілі нас пачаць шырокую барацьбу.

Палесцінская праблема. Нагадаем, калі і як яна ўзнікла.

У адну з красавіцкіх начэй 1948 года атрады ізраільскіх тэрарыстаў з арганізацый «Іргун цвей мумі» і «Штэрн» учынілі разню ў арабскай вёсцы Дэйр-Ясін. Загінула звыш 250 чалавек, сярод іх каля 100 жанчын і дзяцей. Дэйр-Ясін — толькі адзін з многіх эпізодаў масавага тэрору, арганізаванага сіяністамі напярэдадні ўзнікнення дзяржавы Ізраіль. Як вядома, рашэнне Генеральнай Асамблеі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый ад 29 лістапада 1947 года прадугледжвала абвяшчэнне на былой англійскай падмандатнай тэрыторыі Палесціны дзвюх дзяржаў — яўрэйскай і арабскай. Але сіяністы, развязаўшы разню, прымусілі палесцінцаў пакінуць зямлю продкаў і перасяліцца ў суседнія краіны: Ліван, Іарданію, Егіпет і іншыя.

Так з'явілася нацыянальная праблема народа, пазбаўленага права на самавызначэнне, на стварэнне сваёй дзяржавы.

Але палесцінцы не скарыліся. У складаных умовах ізраільскай акупацыі, змоў і інтрыг сіл імперыялізму, сіянізму і мясцовай рэакцыі арабскі народ Палесціны змагаецца за сваё існаванне, за стварэнне сваёй уласнай дзяржавы.

Пра гэта гаварылі палесцінскія госці і на прэс-канферэнцыі, прысвечанай адкрыццю Дзён дружбы і салідарнасці з арабскім народам Палесціны.

— Мы помнім, што Савецкая дзяржава, іншыя сацыялістычныя краіны першымі прызналі Арганізацыю вызвалення Палесціны як адзінага законнага прадстаўніка нашага народа, —падкрэсліў на сустрэчы з журналістамі Тайсір Куба. — Мы таксама высока цэнім рашэнне СССР і іншых сацыялістычных краін даць нашым прадстаўнікам дыпламатычны статус. Дзякуючы самаадданай барацьбе палесцінскага народа, дзякуючы падтрымцы з боку сацыялістычнай садружнасці, усіх прагрэсіўных сіл свету пашыраецца прызнанне Арганізацыі вызвалення Палесціны. Нашы прадстаўнікі сёння ўжо ў 125 краінах. Гэта значна больш, чым колькасць дзяржаў, што прызнаюць Ізраіль.

У складзе палесцінскай дэлегацыі быў таксама нацыянальны фальклорны ансамбль. Яго кіраўнік Сальма Рызк гаварыла, што барацьба з ворагам вядзецца не толькі зброяй. Сіяністы імкнуцца не проста знішчыць палесцінскі народ, але і скалечыць яго духоўна. «Яны крадуць наша мастацтва, крадуць нашы песні, танцы». І свае выступленні палесцінскія артысты супрацьпастаўляюць ізраільскай экспансіі. «Галоўная наша задача,— адзначалі яны, — зрабіць усё, каб захаваць нацыянальную культуру для будучых пакаленняў, якія будуць жыць у міры на сваёй радзіме».

Але пакуль што мір для арабскага народа Палесціны застаецца марай. Марай, якую каваны бот сіяністаў утоптвае ў залітую крывёй арабаў зямлю. Марай, якую штодня апаганьвае крывадушнасць Вашынгтона.

Развязаўшы шырокую і масіраваную агрэсію супраць суседняга Лівана (яшчэ адно звяно ў доўгім ланцугу агрэсіўных дзеянняў сіяністаў), Ізраіль мае на мэце патапіць у крыві Палесцінскі рух супраціўлення, наогул зняць з парадку дня пытанне аб рэалізацыі законных правоў палесцінцаў.

Першыя паведамленні пра масіраваныя налёты ізраільскай авіяцыі на Бейрут паступілі, калі палесцінская дэлегацыя яшчэ знаходзілася ў Мінску. Адзін з членаў дэлегацыі Ахмет Наджэм сказаў: «Гэта — вайна».

— Сіяністы маюць сучасныя самалёты і танкі, — гаварыў ён. — Злучаныя Штаты забяспечваюць агрэсара самай сучаснай зброяй, таму што разглядаюць Ізраіль як свайго самага надзейнага саюзніка, свайго жандара на Блізкім Усходзе. Сіяністы маюць на мэце знішчыць наш народ, задушыць нашу рэвалюцыю. Але чым больш намаганняў прыкладае вораг, тым мацнейшым становіцца супраціўленне, тым згуртаваней наш народ, тым больш адданы ідэалам рэвалюцыі.

А кіраўнік дэлегацыі Тайсір Куба ў гутарцы з карэспандэнтам перад ад'ездам сказаў:

— Я карыстаюся магчымасцю, каб звярнуцца да ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва: прымайце актыўны ўдзел у міжнародным руху супраць сіяністкіх агрэсараў, выкрывайце злачынны альянс амерыканскіх імперыялістаў і сіяністаў на чале з Бегінам, бо яны з'яўляюцца ворагамі не толькі народа Палесціны, іншых арабскіх народаў, але ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва, усіх дэмакратычных сіл.

І я вельмі ўдзячны ўсім, хто прымаў удзел у арганізацыі і правядзенні Дзён дружбы і салідарнасці з арабскім народам Палесціны,— сказаў у заключэнне Тайсір Куба. — Я ўпэўнены, што гэтыя Дні дадуць магчымасць яшчэ цясней згуртаваць рады барацьбітоў за справядлівае ўрэгуляванне палесцінскай праблемы, за трывалы мір ва ўсім свеце.

Уладзімір МЯЛЕШКА.



Члены дэлегацыі Таварыства палесціна-савецкай дружбы ў Мінску.

СОЗДАНИЕ СССР — ЖИВОЕ ВОПЛОЩЕНИЕ ЛЕНИНСКИХ ПРИНЦИПОВ НАЦИОНАЛЬНОЙ ПОЛИТИКИ

БЕЗ ЛЖИ И ЖЕЛЕЗА

На протяжении всей истории человечества национальный вопрос был и для многих государств остается еще и сегодня одной из наиболее острых и сложных проблем общественной жизни. Трудным он был и для такой многонациональной страны, как Советский Союз. Но об этом уже можно говорить в прошедшем времени.

Царскую Россию, где до Великого Октября к угнетенным нациям принадлежало не менее 57 процентов населения, или свыше 100 миллионов человек, проживавших преимущественно на окраинах, справедливо называли тюрьмой народов. Наследство первому в мире государству рабочих и крестьян по вопросам национальных отношений осталось незавидное. А ныне в Советском Союзе, который отмечает в декабре этого года 60-летие своего образования, одной дружной семьей живут более ста наций и народностей, многие из которых только благодаря Советской власти впервые создали свою национальную государственность. В состав СССР как советской федерации входят 35 национальных государств (15 союзных и 20 автономных республик), а также 18 национальных государственных образований (8 автономных областей и 10 автономных округов). Создание СССР, подчеркивается в постановлении ЦК КПСС, посвященном юбилею, — это живое воплощение идей В. И. Ленина, разработанных им принципов национальной политики.

Какие же принципы были положены Лениным в основу построения многонационального социалистического государства?

УВАЖАЯ ИНТЕРЕСЫ НАЦИЙ

Этому интервью в конце октября нынешнего года исполнится 60 лет. Его В. И. Ленин дал корреспонденту английских изданий «Обсервер» и «Манчестер гардиан» М. Фарбману в период, когда объединительное движение независимых суверенных советских республик находилось на заключительной стадии. Этот процесс был начат по инициативе самих советских республик с целью объединения своих сил для построения социалистического общества и защиты от империалистических государств.

Отвечая на вопросы корреспондента, Ленин высказал мысли, которые отражают один из важнейших принципов решения национального вопроса в государстве рабочих и крестьян. «Наш опыт создал в нас непреклонное убеждение, что только громадная внимательность к интересам различных наций устраняет почву для конфликтов, устраняет взаимное недоверие, устраняет опасение каких-нибудь интриг, создает то доверие, в особенности рабочих и крестьян, говорящих на разных языках, без которого ни мирные отношения между народами, ни сколько-нибудь успешное развитие всего того, что есть ценного в современной цивилизации, абсолютно невозможны».

Еще в 1903 году Ленин настоял на том, чтобы положение о праве наций на самоопределение вплоть до отделения от России и создания самостоятельного государства было записано в программе созданной им пролетарской партии нового типа. Он внимательно следил за выполнением этого положения, отстаивал его важность и необходимость в борьбе с оппортунистами. После победы в 1917 году социалистической революции Ленин много сил и времени отдал теоретической разработке национального вопроса, определению важнейших программных задач партии в этой области. Со дня свершения революции до 6 марта 1923 года им написано около 400 писем, статей, брошюр, докладов, тезисов, проектов резолюций, которые непосредственно посвящены национальному вопросу или касаются его. И лейтмотивом многих документов является требование полнее учитывать интересы наций и народностей, проявлять мягкость и осторожность в отношениях с представителями национальных меньшинств.

СОВЕРШЕННО ДОБРОВОЛЬНО

Победа Великого Октября и политика КПСС пробудили народы России к устройству своей национальной государственности. Нерусские народы создавали советские республики, а Советская Россия без промедления признавала их суверенитет и самостоятельность. Как подчеркивал В. И. Ленин, это вызвало в буржуазной прессе капиталистических стран крики о том, что большевики разрушают русское государство, что они не умеют управлять, что от них уходят все национальности. Но Ленин, КПСС твердо верили, что справедливые принципы большевиков, остававшихся сторонниками создания единого крупного и сильного государства, будут одобрены народами, что, как говорил Ленин, «наше собственное управление лучше слов докажет всем трудящимся наши истинные цели и стремления».

Что питало эту веру? В январе 1918 года III Всероссийский съезд Советов образовал Российскую Федерацию, как федерацию свободных республик разных наций, населявших Россию, окончательно признал новый государственный строй социалистической Советской республики. Большевики управляли, не разделяя, а соединяя всех трудящихся их живыми, общими интересами и классовым сознанием. Выступая с заключительным словом перед закрытием съезда, В. И. Ленин, с глубокой убежденностью говорил, что вокруг революционной России все больше будут группироваться различные федерации свободных наций. «Совершенно добровольно, без лжи и железа, — подчеркивал он, — будет расти эта федерация, и она несокрушима.

Советская Россия стала прообразом крупного союзного государства. В ходе объединительного процесса Ленин настаивал на том, чтобы ни у одного народа — большого или малого — не было никаких привилегий, чтобы Российская Федерация признавала себя равной со всеми другими советскими республиками. Добровольность объединения советских национальных государств стала одним из основных ленинских принципов вхождения в свободный союз народов. Она обеспечивается тем, что каждая нация является суверенной и равноправной, что каждой республике даются юридические гарантии — право свободного выхода из Союза.

Соблюдением этих ленинских принципов и сильно наше государство.

Дмитрий ГАИМАКОВ.

ПО СТРАНИЦАМ ИЗДАНИЙ ЗАРУБЕЖНЫХ СООТЕЧЕСТВЕННИКОВ

РУССКИЙ ГОЛОС

ЗА ШИРМОЙ ДЕМОКРАТИИ

— Какое коммунистическое воспитание получила ваша дочь? — без всяких предисловий, сохраняя твердокаменное выражение лица, спросил меня один из деятелей, которым по роду службы положено «исследовать» прошлое эмигрантов из стран социалистического лагеря.

— Мне кажется, что никакого, — ответил я и добавил: — Ко дню нашего отъезда ей было всего... две недели...

— Гм-м. Вы уверены? Ну, что ж, так и запишем.

Честно признаться, вначале я был немного поражен. Однако за годы жизни в Америке, попривыкнув к некоей «роковой» неизбежности выяснений отношения к коммунизму и к Компартии, я понял, что вопрос, мне заданный, не случаен. Он находится в полном соответствии с общей тенденцией.

Коммунизм в США давно уже используется в качестве пугала. Здесь его стараются изобразить как своеобразную земную реализацию ада. В стране, рекламирующей себя цитаделью свободы, где якобы позволительно придерживаться любых политических взглядов и убеждений, безопаснее скрывать не только коммунистические, но и социалистические симпатии. Впрочем, для рядового американца нет существенной разницы между тем и другим. Быть же членом соответствующей партии, значит быть изгоем и постоянно находиться под недреманным оком ФБР.

Если вы принадлежите к Церкви Сатаны, то вы вполне вписываетесь в американское общество. Все, что угодно, только не коммунизм!

При всех столь старательно рекламируемых «свободах», США — страна крайней идеологической нетерпимости, которая даже не всегда заметна для обывателя, ибо весьма тщательно маскируется. Например, вы можете свободно размахивать кулаками, оскорблять самого президента, митинговать и т. п. Вам не только не запретят этого, но и сообщат о вашем демарше в прессе. Вот это-то и есть «демократическая ширма». «Ура! Мы свободны, как никто!»— вопят розовощекие поедатели поп-корна. Но надо же видеть и изнанку подобной демократии. Как только ваш «протест» выйдет за рамки эмоций, обретет некоторую организованность, получит более или менее широкую поддержку, вашей дальнейшей судьбе не позавидуешь. Неприятности — и не мелкие — вам гарантированы.

В порядке иллюстрации к сказанному считаю не лишним привести запомнившееся мне сообщение «Сан-Франциско кроникл» от 16 апреля сего года:

«Архитектор Сеймур Мейерсон заявил, что лос-анджелесская полиция преследовала его на протяжении пяти лет за левые политические взгляды. Специальные агенты вели за ним постоянную слежку, неоднократно прокалывали шины его автомобиля, бросали камни в окна квартиры, одним из которых угодили в голову жены Мейерсона Вивиан.

Полиция признала тот факт, что Мейерсон действительно находился под наблюдением, однако отрицала все остальные обвинения по ее адресу. Около ста человек обвинило лос-анджелесских соглядатаев в нарушении конституции».

Как говорится, комментарии излишни. Хотелось бы только знать, что думают о подобного рода преследованиях инакомыслов те, кто взахлеб провозглашает Соединенные Штаты «цитаделью и форпостом свободы и демократии»?

В. ГОРСКИЙ,
Монтерей,
Калифорния.

США.

ВЕСТНИК

105 ДНЕЙ НА РОДИНЕ

Поезд из Москвы умчал нас на Барановичи, где мы сделали пересадку, и утром были в Лунинце. В эту ночь в поезде мне было не до сна. Как только начало светать, я с волнением всматривался в пробегавшие за окном родные белорусские просторы, леса, необъятные поля пшеницы, новостройки, станции. На вокзале в Лунинце меня окружили встречающие: сестра Анна, племянники Иван Шафран и Миша Пипченко с женами, все взволнованные, с букетами живых цветов. Вскоре я был уже в доме родной сестры Ксении и ее семьи, где провел 40 дней. Через неделю я почувствовал себя здесь так, будто никогда не уезжал отсюда.

Лунинец — небольшой город. Здесь построен завод электродвигателей, один из крупнейших в СССР, механический завод по ремонту сельскохозяйственного оборудования, а также масло-молочный. На этих трех предприятиях работает почти половина населения города. Строятся пяти- и девятиэтажные дома, открыт новый универмаг, в котором много товаров. Однако немало еще предстоит сделать для украшения города: некоторые старые здания ждут капитального ремонта, а улицы — асфальтирования.

И достижения советского народа, и те трудности, которые еще необходимо преодолеть, в полной мере отражаются в жизни этого небольшого городка. Жители его, как и все, с кем мне довелось беседовать в СССР, уверены, что если только удастся сохранить мир, все проблемы будут решены, жизненный уровень народа станет еще выше.

Побывал я также в гостях у сватов в деревне Крестуново, где колхозное хозяйство содержится в образцовом порядке, улицы чистые и ухоженные, колхозники живут зажиточно, держат домашний скот, имеют достаточный запас кормов. У каждого есть денежные сбережения.

К сожалению, довольно долго пришлось мне ожидать разрешения на поездку в деревню Симоновичи, откуда я родом, однако все уладилось, и я провел в своей родной деревне 28 дней. Больших перемен с моего последнего посещения в 1978 году я здесь не нашел. Серьезная проблема для сельсовета в Симоновичах, как и во многих других селах СССР, — как удержать молодежь в деревне? Закончив школу-десятилетку, большинство юношей и девушек уезжают в город поступать в высшие учебные заведения или на заводы и фабрики.

Однако живут колхозники неплохо; в прошлом году собрали очень большой урожай. В любом доме — телевизор, холодильник, радиоприемник. Жизнь с каждым годом налаживается, становится легче и интереснее.

Не только в Симоновичах, но и в окрестных деревнях Борки, Марковичи, Брашевичская Вулька встречали меня с характерным белорусским гостеприимством. В каждом доме было что поставить на стол, чем наполнить бокалы, чтобы поднять тост за встречу, за мир и дружбу, за счастливое будущее наших детей и внуков.

С удовольствием побывал я в новых городах Солигорске и Белоозерске, где работают мои внуки. Молодому шахтерскому городу Солигорску всего 23 года, он вырос на месте деревушки Чижевичи за одну семилетку. Город — красавец, ровесник большинства своих молодых жителей, насчитывает уже 80 тысяч населения. В нем создается комплекс предприятий ведущих отраслей промышленности: горнодобывающей, минеральных удобрений (работает уже 4 завода), химической, легкой промышленности и др. Солигорцы живут в новых комфортабельных домах от 5 до 14 этажей, в городе открыт горно-химический техникум и другие специальные учебные заведения, общеобразовательные и музыкальная школы. К услугам жителей Дом культуры, широкоформатный кинотеатр на 500 мест, библиотеки, клубы. Любимое место отдыха горняков и химиков — искусственное озеро в хвойном лесу. Городские магазины хорошо снабжаются продовольствием и другими товарами, многие жители имеют собственные машины.

Примерно то же можно сказать о Белоозерске. Внук мой, к примеру, работает механиком: зарплата его составляет 125 рублей в месяц, со сверхурочными — 150; за 4-комнатную квартиру платит всего 13 рублей в месяц. Жена также работает, они воспитывают двоих детей, приобрели машину, живут хорошо и дружно. Вообще состав населения в основном — молодежь, в каждом дворе — множество ребятишек. Бурно идет строительство новых домов, школ, чтобы удовлетворить потребности молодых семей. Государство прилагает все усилия, чтобы в магазинах было всего вдоволь.

Вот, в основном, то, что мне хотелось рассказать о недавней, 4-й поездке на Родину. Конечно, для того чтобы изложить все свои впечатления, потребовалось бы написать целую книгу. Однако не могу не сказать: пребывание на родной земле неизменно доставляет большую, ни с чем не сравнимую радость!

Хочу от всей души поблагодарить за гостеприимство, за хлеб-соль своих родных, знакомых, всех тех чудесных людей, с которыми я встретился в Советском Союзе. Большое спасибо вам всем, друзья, и надеюсь, что мы еще встретимся!

И. КЛИМЧУК,
Ванкувер.

Канада.

У горадзе над Бугам адбылося традыцыйнае свята «Брэсцкая вясна». На вуліцах і плошчах, у парках і скверах Брэста выступалі мастацкія калектывы з Беларусі, РСФСР і Украіны, праходзілі сустрэчы з ветэранамі вайны і працы, перадавікамі вытворчасці, пісьменнікамі трох брацкіх рэспублік, сваё майстэрства паказвалі спартсмены.

НА ЗДЫМКАХ: масавае выступленне ўдзельнікаў свята на плошчы У. І. Леніна; перад жыхарамі вуліцы Набярэжная выступае ўкраінскі ансамбль «Валынянка».

Фота Э. КАБЯКА.

МАРЫЯ БІЕШУ — ЛАЎРЭАТ ЛЕНІНСКАЙ ПРЭМІІ

«МАДАМ БАТЭРФЛЯЙ» З МАЛДАЎСКАЙ ВЁСКІ ВАЛАНТАРАЎКІ

У творчым лёсе малдаўскай спявачкі Марыі Біешу было многа хвалюючых падзей. У тым ліку — перамогі на III Міжнародным конкурсе імя Чайкоўскага ў Маскве і на Міжнародным конкурсе ў Японіі. Але галоўнае — гэта прызнанне слухачоў, любоў людзей, якая ўвасоблена і ў перапоўненых глядзельных залах, і ў высокім званні народнай артысткі СССР, якое ў Савецкай краіне надаецца лепшым майстрам мастацтва, і ў тым вялікім даверы, які ёй аказалі суайчыннікі, выбіраючы дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР.

Сёння, праз многа гадоў, Марыя згадвае, як яна прыехала ў родную вёску Валантараўка з дыпломам агранома і... пасведчаннем аб залічэнні ў кансерваторыю ў Кішынёве, сталіцы Малдавіі:

— Так пачыналася мая вакальная кар'ера...

Пасля кансерваторыі была стажыроўка ў «Ла Скала». І славуты маэстра Бара на першым жа праслухоўванні ўсклікнуў: «Будзьце ўдзячны вашай маці за цудоўны голас!» Марыя з гордасцю: «Мама спявала лепш за ўсіх у нашым сяле». Біешу падрыхтавала тады ў Італіі на мове арыгінала і з поспехам выканала чатыры партыі — Леаноры з «Трубадура», Аіды, Тоскі і Мадам Батэрфляй.

Цяпер у рэпертуары Марыі Біешу дзесяткі оперных партый: Таццяна ў «Яўгеніі Анегіне», Кума ў «Чарадзейцы» і Ліза ў «Пікавай даме» Чайкоўскага, Земфіра ў оперы Рахманінава «Алека», Неда ў «Паяцах» Леанкавала, Дэздэмона ў оперы Вердзі «Атэла», Норма ў аднайменнай оперы Белліні, Домніка ў «Гераічнай баладзе» малдаўскага кампазітара Стырчы. Большасць арый з гэтых опер у яе выкананні запісаны на пласцінкі і пастаянна даступны самай шырокай аўдыторыі — у дапаўненне да трансляцый канцэртаў Марыі Біешу тэлебачаннем, удзелу яе ў музычных перадачах радыё, нарэшце, да вялікай гастрольнай дзейнасці.

Але адна роля займае ў жыцці Марыі Біешу асаблівае месца... У 1967 годзе маладая спявачка адмовілася ад ангажэмента ў «Ла Скала», куды была запрошана на партыю Аіды, і паехала ў Японію, дзе праводзіўся першы Міжнародны конкурс імя Мадам Батэрфляй. Тытул «Лепшай Чыо-Чыо-сан свету» і Залаты кубак аспрэчвалі 34 прэтэндэнткі з 20 краін. Пераможцай стала Марыя Біешу. З гэтага часу кожныя тры гады яна гасцюе ў Японіі. У 1970—спявала на адкрыцці помніка японскай спявачцы Міуры Тамакі, якой і прысвечаны гэты традыцыйны такійскі музычны конкурс. У 1973—Біешу разам з Марыяй Калас і Джузепе дзі Стэфана была ўжо тут членам журы.

Біешу падкупляе знаўцаў дасканалым веданнем старадаўняга японскага этыкету, мастацтва складання букетаў — ікебана, пранікненнем у самую псіхалогію і вытанчаную пластыку японскай гейшы. І літаральна ўсіх пакарае створаны ёю мяккі, жаноцкі, лірычны вобраз Чыо-Чыо-сан.

Спявачку Марыю Біешу стварылі не толькі тонкая мастацкая інтуіцыя, сама прырода яе дзіўнага голасу, аднолькава схільнага і да драматычных, і да лірычных партый, голасу, адшліфаванага выдатнай школай, але і карпатлівая, штодзённая, часам знясільваючая праца. Яна любіць і ўмее працаваць.

Сама актрыса расказвае: «Мая праца — спектаклі, канцэрты, рэпетыцыі, шматгадзінная работа над новымі партыямі і канцэртнымі праграмамі. Мая праца — сустрэчы з гледачамі розных краін. У кожнай сваёй ролі я імкнуся перадаць тую атмасферу вялікага напалу страсцей, у якой жывуць мае гераіні: калі трагедыя — то вялікая, калі любоў —то на ўсё жыццё, калі гора — смяртэльнае. У пастаянным творчым напружанні, у грамадскай рабоце і знаходжу я крыніцу новых жыццёвых сіл».

За канцэртныя праграмы 1978—1980 гадоў Марыя Біешу ўдастоена Ленінскай прэміі.

Вадзім КІСЯЛЁЎ.

вобразы мілыя роднага краю

СМОЛЬНЯ

У 1910 годзе ў Мікалаеўшчыне адбыўся пажар. Паводле ўспамінаў Язэпа Міцкевіча, брата Якуба Коласа, згарэла і карчма. Дзядзька Антось атрымаў дазвол забудавацца ў Смольні. Ён паехаў у вёску Яршы, купіў там хату, разабраў яе, звёз да Нёмана, збіў у плыт і прыгнаў да Смольні. Хату паставілі ў 1910 годзе, крыху пазней зрабілі прыбудову да яе, а таксама пабудавалі на сядзібе абору, прыгрэбнік, перавезлі з Мікалаеўшчыны ацалелае гумно. Беручы пад увагу прыгадкі брата народнага паэта, хата на дзве паловы была ўжо ў Смольні да першага прыезду сюды Якуба Коласа ў 1911 годзе. У другой палове хаты быў спрат, аднак служыла яна не толькі дзеля гаспадарчых патрэб. У ёй жылі ўлетку.

Як сведчаць архіўныя дакументы, Кастусь Міцкевіч быў выпушчаны на волю з мінскай губернскай турмы 15 верасня 1911 года. Наведаўшы свайго таварыша ў Мінску, Якуб Колас завітаў у вёску Хажова каля Маладзечна, а пасля выехаў у Вільню. Паэт вёз туды «тры сшыткі ў цыратовых вокладках». З Вільні ён накіраваўся ў Ландварова, дзе жыў Янка Касяк, які «звязаў сваё жыццё і дзейнасць з грамадска - палітычным і рэвалюцыйным рухам». У верасні 1911 года Якуб Колас прыехаў у Смольню. Тут, у каторы раз на сваім вяку, абжывалі новае месца Коласава маці з дзецьмі і дзядзька Антось.

Пра першы прыезд у Смольню народны пясняр успамінаў: «Туга не адпускала мяне. Не бачыў выхаду. Усё вакол нібы замкнулася... Няма надзеі на існаванне. Невядома, як заўтра жыць, што рабіць». У мінскай турме Якуб Колас пачаў пісаць паэму «Новая зямля». У астрожных мурах прыйшла да паэта думка і пра «Сымона - музыку». Абодва творы хвалявалі паэта падчас яго знаходжання ў Смольні, дзе ён бываў наездамі ў 1911—1914 гадах. Хутар Смольня месціўся непадалёку ад вёскі Мікалаеўшчыны. З ліста, напісанага ўлетку 1913 года, даведваемся, што Якуб Колас даслаў з Мікалаеўшчыны ў рэдакцыю газеты «Наша ніва» апавяданне «Знайшлі».

На сядзібе ў Смольні паэт у 1911 годзе пасадзіў ліпы. Наведаўшы хутар 2 чэрвеня 1947 года, дзядзька Якуб запісаў у дзённіку: «Мае дрэвы павырасталі. Проста не верыцца, што я саджаў іх 36 гадоў назад і так паразрасталіся за гэты час...»

У Смольні адбылася першая сустрэча двух славутых беларускіх песняроў. З Акопаў у лісце да Б. Эпімаха-Шыпілы за 26 ліпеня 1912 года Янка Купала пісаў: «У мяне нічога цікавага не чуваць. Думаю толькі аб тым, каб ях дастаць грошы на дарогу, і больш нічога. У суботу еду ў Стоўбцы да Коласа...»

Спаткацца з Янкам Купалам хацелася і Якубу Коласу: «Абставіны майго жыцця складаліся так, што я не мог паехаць да Янкі Купалы, каб сустрэцца з ім «вока на вока», паехаць як да друга, якога я глыбока палюбіў за яго творы. Я быў пад нядрэмным вокам паліцыі. За кожным крокам маім яна пільна сачыла... Мая першая сустрэча з Янкам Купалам адбылася толькі летам 1912 года, амаль праз год пасля майго вызвалення з астрога... Я жыў у сваіх родных на Нёмане, у паўтара кіламетрах ад вёскі Мікалаеўшчыны. Якраз на тую пару я быў у сяле ў аднаго з сваіх прыяцеляў. І раптам прыбягае адна з маіх сясцёр. Усхваляваная, стаміўшыся ад шпаркай хады, яна адразу з запалам сказала: «Да цябе прыйшоў Янка Купала!» Гэтыя словы моцна ўразілі і мяне. Я зараз жа развітаўся з прыяцелем і хутка падаўся дахаты на сустрэчу з паэтам, якога я ведаў даўно, але ні разу яшчэ не бачыў і якога так моцна хацелася пабачыць».

Пра падарожжа ў Смольню чытаем у Янкі Купалы: «Пазваў мяне ў госці Якуб Колас. Грошай, як заўсёды, у мяне не было, каб наняць балагола, і я рашыў са станцыі Стоўбцы ў вёскі ісці пехатой. Іду, іду, ур... і цямнець пачынае, круго... лес. Няма ў каго спытацца дарогі. Баяўся, што прыйдзецца ў незнаёмым вялікім лесе заночаваць, а тут і есці хочацца. Раптам павеяла вільгаццю, і я ўспомніў, што, па словах Якуба Коласа, Мікалаеўшчына стаіць на беразе Нёмана. Вось і пайшоў я ў гэтым напрамку. Так дайшоў шчасліва да самай Коласавай хаты».

Дарэчы, інтэр'ер мемарыяльнай хаты ў Смольні адноўлены паводле ўспамінаў сваякоў народнага паэта. Этнаграфічныя экспанаты далі магчымасць уявіць тагачасны сялянскі побыт. У Смольні дажывалі свой век «новазямельцы» — Ганна Міцкевіч, маці Якуба Коласа, яго дзядзька Антось і брат Язэп Міцкевіч, надзвычайны самабытны чытальнік твораў песняра.

Цётка Алена, сястра паэта, апавядала пра маці: «Мама вельмі любіла «Новую зямлю», сказала Кастусю, як ён быў дома: «Вот, сынок, як ты хораша напісаў. Ты ўсё роўна, як з маёй душы пабыў: як быццам прачытаў усё, што я думаю, што я чую, як бы мяне ўсю разгадаў. Здаецца, слухала б і слухала б увесь час і ніколі не стамілася б, сынок». Ёй нам было зразумела ўсё чыста — і словы гэтыя, і жыццё».

У Смольні 8 чэрвеня 1967 года быў адчынены філіял Літаратурнага музея Якуба Коласа. Музейны дзядзінец у гэтай мясціне складаецца з дзвюх частак: мемарыяльнай і экспазіцыйна - выставачнай. Мемарыяльная хата стала музеем у 1972 годзе. У ёй доўгі час жыў Язэп Міцкевіч. Сёлета адноўлена правая палова хаты. Новая экспазіцыя ў мураваным будынку, прымеркаваная да 100-годдзя з дня нараджэння народнага паэта, будзе адлюстроўваць біяграфію і творчы шлях песняра.

...Прайшло шмат часу з тае пары, калі ў Смольні беларускі пясняр пасадзіў дрэвы, якім пашчасціла чуць гутарку Янкі Купалы і Якуба Коласа. Улетку ліпы здзіўляюць гасцей сваім пышным уборам і, як зазначыў калісьці сам паэт, проста просяць пэндзля мастака-пейзажыста.

Генадзь ТУМАС.



Хата Міцкевічаў у Смольні, дзе ўпершыню сустрэліся Янка Купала і Якуб Колас.

Малюнак М. КУПАВЫ.

НАРОДУ, З ЯКІМ ЗРАДНІЎСЯ

НА МАЛЬБЕРЦЕ—НЕБА

Песняром беларускага пейзажу называюць аднаго са старэйшых мастакоў Брэстчыны Пятра Данелію. Край раўнінных далягляда́ў з блакітам вады і нябёсаў, з яркімі фарбамі вясны і восені аднойчы і назаўсёды ўвайшоў у сэрца гэтага чалавека.

Як жа сталася, што лепшыя працы грузіна Пятра Данеліі даўно сталі здабыткам беларускага выяўленчага мастацтва? Па прызнанню самога мастака, на пачатку жыццёвага і творчага шляху яму двойчы пашанцавала. Першы раз яшчэ ў дзяцінстве, калі ён паверыў у сваё прызванне. Таму пастаянна маляваў: і будучы школьнікам, у далёкай ад Брэста сонечнай Махачкале, і ў маскоўскім мастацкім вучылішчы, і на вайне з белафінамі, і тады, калі здавалася, што зусім не да мастацтва — у гады Вялікай Айчыннай. Другі раз шчасце не абмінула мастака, калі Беларусь, Брэст сталі для яго другой радзімай. Як і яго аднагодкі, за час вайны Данелія збалеў па мірнай працы. Таму так прагна і натхнёна маляваў з натуры — цудоўныя краявіды Брэстчыны, партрэты блізкіх і знаёмых людзей.

Але ў кожнага ўдзельніка Вялікай Айчыннай вайны на ўсё жыццё засталіся незагоеныя рубцы і на сэрцы, і ў памяці. Яны не давалі спакою і Данеліі. Таму мастак пачаў пісаць эцюды, прысвечаныя абаронцам гераічнай цытадэлі над Бугам, укладваючы ў іх усё выпакутаванае ў гады ліхалецця. А неўзабаве лепшыя з гэтых работ — «Цярэспальскія вароты», «Інтэр'ер клуба Брэсцкай крэпасці», «Мой сябра», «Руіны Брэсцкай крэпасці» — ужо экспанаваліся на абласных і рэспубліканскіх выстаўках.

Работы П. Данеліі сведчаць пра здольнасць мастака тонка разумець, адчуваць прыроду, глыбока пранікаць у з'явы жыцця. Менавіта гэта надае яго творам адметнасць, цеплыню.

Глядач не знойдзе ў іх застылай цішыні і заспакоенасці. Рух вялікіх светлых і цёмных воблакаў у небе, пластычныя малюнкі зямлі, акорды святла і колеру ствараюць драматычныя мелодыі барацьбы дабра са злом у прыродзе.

Першымі работамі, дзе мастак паспрабаваў праз вобраз неба раскрыць сэнс жыцця, былі карціны «Лістападаўскі вецер», «Плывуць аблокі». Абодва гэтыя творы экспанаваліся на юбілейнай Усесаюзнай мастацкай выстаўцы ў Маскве.

«Нішто так у пейзажы не багата рознымі эмоцыямі, фантастычным і нешаблонным,— лічыць сам аўтар,— як неба». Хочацца прывесці словы другога брэсцкага мастака Іосіфа Крупскага: «Мне асабліва запомніліся пайзажныя работы Данеліі — «Успаміны», «Над цішынёй», «Чырвань у срэбры», якія ўспрымаюцца як трыпціх і задумай мастака звязаны ў адзінае».

Карціна «Успаміны» — гэта палёт у мінулае, у нялёгкі, але ўсё ж шчаслівы час дзяцінства. Зямля. Хмурыя аблокі. А паміж імі — блакітныя прасветы. Ля ракі — бесклапотныя хлапчукі з коньмі.

«Над цішынёй». Навальнічная хмара. Кароткае імгненне цішыні. Вось-вось ударыць гром. Гэта цішыня — чаканне...

Але неўзабаве прамень сонца, ахапіўшы зямлю, зачырваніў дрэвы, засерабрыў нябёсы, велічныя і ўрачыстыя. І льецца на зямлю скрозь воблакі нястрымная радасць. «Чырвань у срэбры».

Трэба адзначыць, што ўсе тры гэтыя работы набыты Дзяржаўным мастацкім музеем БССР, а карціна «Над цішынёй» экспанавалася на выстаўцы ў Сафіі (Балгарыя).

Творчы дыяпазон мастака надзвычай шырокі. Ён з поспехам працуе не толькі ў пейзажы, але і ў манументальна-дэкаратыўным роспісе, партрэце, медальерным мастацтве, скульптуры. Хто набываў у Пінскім гарадскім Доме культуры, абавязкова звярнуў увагу на зроблены там роспіс «Мастацтва акрыляе». Яго аўтар—П. Данелія. Мастаком створана некалькі бюстаў У. І. Леніна, а таксама скульптурная работа, прысвечаная бясстрашнаму падпольшчыку Сяргею Багданчуку, па-зверску забітаму польскай дэфензівай. На малюнках П. Данеліі створана некалькі арыгінальных медалёў. Адзін з іх — «950-годдзю горада Брэста».

...А на мальберце мастака новы пейзаж — «Бярозавы гай над ціхай палескай рачулкай». Хлопчыкі з веласіпедамі. Відаць, прыехалі купацца. І светлыя аблокі на блакітным і вечным небе...

Пейзажу, як і раней, надаецца перавага. П. Данелія не ўяўляе свайго жыцця без лясоў, палеткаў, рэк і азёраў Брэстчыны. Яны для мастака, што жывыя істоты,— умеюць і слухаць, і расказваць.

Уладзімір ЗАМКАВЕЦ.

НА ЗДЫМКАХ: мастак П. ДАНЕЛІЯ на фоне манументальнага роспісу «Мастацтва акрыляе»; фрагмент палатна «Палеская песня»; краявід «Зімовая казка».

выконваем просьбы землякоў

МСЦІСЛАЎ

МІНУЛАЕ І СУЧАСНАЕ ГЭТАГА ГОРАДА ЦІКАВІЦЬ НАДЗЕЮ ОСТЭРБАН-ГАЛІЁНКА З ГАЛАНДЫІ

Датай узнікнення Мсціслава прынята лічыць 1135 год: менавіта пад гэтым годам горад упамінаецца ў Іпацьеўскім летапісе. Але апошнія даследаванні даюць падставу меркаваць, што ўзнік Мсціслаў трохі раней — можа нават у 1127 годзе. Расшыфроўка запісаў зборніка XVI стагоддзя Кіеўскага Міхайлаўскага манастыра ўказвае і на тое, што закладзены горад не Мсціславам, як лічылася раней, а яго сынам — Расціславам Смаленскім.

Мсціслаў — адзін з самых старажытных гарадоў Беларусі, але да апошняга часу, на жаль, было мала што вядома з яго сівой мінуўшчыны. І толькі з пачаткам у 1959 годзе работ экспедыцыі Інстытута археалогіі Акадэміі навук СССР усё больш і больш раскрываецца яго цікавая гісторыя. Нягледзячы на тое, што Мсціслаў зведаў варожыя асады, пажары, у ім да нашага часу захавалася шмат выдатных старажытных помнікаў.

Гістарычны цэнтр горада складаецца з дзвюх частак. Першая, што была асяродкам першапачатковага горада — Замкавая гара. Другая — ахоплівае былую галоўную і далучаныя да яе вуліцы. Тут сканцэнтравана гістарычна каштоўная забудова.

Існуе некалькі легенд пра Дзявочую гару, якая знаходзіцца на высокім беразе ракі Віхры. У адной з іх гаворыцца аб тым, нібыта гэтую гару дзяўчаты нанасілі фартухамі. Але археалагічныя раскопкі і даследаванні вучоных паказалі, што на Дзявочай гары было ўмацаванае месца жыхарства радавітай патрыярхальнай сям'і, так званае гарадзішча, якое адносіцца прыкладна да пачатку нашай эры. Насельніцтва гарадзішча займалася пасечным земляробствам, паляваннем і рыбалоўствам. Яно належала да старажытных усходнебалтыйскіх плямён, якія жылі ў гэтых мясцінах у даславянскі час.

Яшчэ большую цікавасць уяўляе Замкавая гара — дзецішча сярэдневяковага горада. Плошча некалі была абнесена высокім валам, частка якога захавалася да нашага часу. На Замкавай гары быў цэнтр княжацкай рэзідэнцыі. І цяпер бачны сляды глыбокіх равоў, што акружалі замак, дамбы, на якіх трымаўся перакідны мост. Відаць нават уезд на гару, ён праходзіў паміж высокімі валамі.

Хаця работы археалагічнай экспедыцыі яшчэ не закончаны, тут ужо знойдзена многа цікавага і нават унікальнага.

На глыбіні 1—1,2 метра вучоныя наткнуліся на вугал зруба і іншыя рэшткі старажытных збудаванняў. Знайшлі нават крыж-складзень, зроблены ў XIV — XV стагоддзях. На глыбіні 1,4 метра ўбачылі вуліцу. Драўляны насціл яе мяняўся сем разоў. Самае старажытнае машчэнне адносіцца да 1242 года. Знойдзены рэшткі асобных сядзіб, дамоў, гаспадарчых пабудоў, падворкаў, а таксама вельмі цікавае збудаванне — рэшткі васьмівугольнай вежы. Ніжэй гэтай вежы аказаліся тры дубовыя зрубы, пастаўленыя ў рад і злучаныя паміж сабою перамычкамі. Напэўна гэта былі абарончыя пабудовы канца XIII стагоддзя.

[Заканчэнне на 8-й стар.].

прэм'еры, выстаўкі, сустрэчы

«МОЙ РОДНЫ КУТ...»

Акінчыцы, Мікалаеўшчына, Ласток, Альбуць, Смольня... У гэтых мясцінах, што раскінуліся ўздоўж правага берага Нёмана, прайшлі дзіцячыя гады Якуба Коласа, адсюль бяруць свой пачатак вытокі творчасці вялікага песняра беларускага народа. Аб гісторыі памятных мясцін, іх увасабленні ў паэзіі і прозе пісьменніка раскажа даведнік «Родны бераг песняра», які хутка выйдзе ў выдавецтве «Полымя». У гэтай кнізе, падрыхтаванай супрацоўнікамі Літаратурнага музея Якуба Коласа, побач з мастацкім апісаннем Прынямоння ўпершыню зведзены ў адно цэлае архіўныя даныя аб усіх заставах і мястэчках, дзе жыла сям'я палясоўшчыка М. Міцкевіча. Складзены яны па дакументах, якія захаваліся ў Цэнтральным дзяржаўным архіве БССР. Іменна на падставе гэтых матэрыялаў адноўлены Акінчыцы, дзе нарадзіўся Колас і дзе да 100-годдзя з дня нараджэння пісьменніка адкрыецца музей.

«Родны бераг песняра» будзе, такім чынам, не проста даведнікам па Прынямонню, але і каштоўным дапаможнікам для даследчыкаў творчасці Коласа.

ПРАЦАЎНІКАМ ВЁСКІ

Прайшоў пяты традыцыйны рэспубліканскі Тыдзень «Майстры мастацтва — працаўнікам вёскі». Як і ў папярэднія гады, у сельскія раёны выязджалі многія вядомыя прафесійныя калектывы і выканаўцы. У свяце прынялі ўдзел Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла БССР імя Р. Шырмы, Дзяржаўны народны хор БССР, фальклорна-харэаграфічны ансамбль «Харошкі», Мінскі камерны аркестр, рок-група «Сузор'е», артысты Дзяржаўнага тэатра музычнай камедыі БССР.

СВЯТА КНІГІ

Чарговы раз у Вільнюскім дзяржаўным універсітэце прайшло традыцыйнае свята кнігі. У ім прынялі ўдзел Саюз пісьменнікаў Літвы і добраахвотнае таварыства аматараў кнігі Літоўскай ССР, госці з Беларусі, Латвіі і Эстоніі.

Ад Саюза пісьменнікаў Беларусі на свяце быў лаўрэат прэміі камсамола рэспублікі, намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Полымя» Генадзь Пашкоў, які сустракаўся з кнігалюбамі некаторых вільнюскіх прадпрыемстваў.

ВЕРШЫ СЯБРОЎ

У гасцях у аматараў кнігі літоўскага горада Друскінінкай пабываў беларускі паэт Рыгор Барадулін. Разам з ім на сустрэчы з чытачамі выступіў яго калега Л. Балтакіс, які пераклаў нядаўна на літоўскую мову кнігу Р. Барадуліна «Бусел на даху».

Сустрэча арганізавана энтузіястамі тутэйшага аддзялення добраахвотнага таварыства аматараў кнігі.

АПЛАДЗІРУЕ СІМФЕРОПАЛЬ

Крымскі акадэмічны рускі драматычны тэатр імя М. Горкага паказаў прэм'еру спектакля «Тры засады» па п'есе беларускага драматурга А. Петрашкевіча. Аўтар, які прысутнічаў на прэм'еры, сказаў:

— Я знаёмлюся са сваімі героямі другі раз. Амаль адначасова спектакль па гэтай п'есе пастаўлены ў Мінску, у тэатры імя Горкага. Абедзве пастаноўкі мне падабаюцца. Рэжысёры ўнеслі ў іх многа свайго, індывідуальнага. Але засталося агульнае — грамадзянская адданасць герояў, выразнасць іх пазіцый, непрымірымасць да зла, недахопаў. П'еса, першая назва якой— «Соль», звязана не толькі з праблемамі аховы прыроды, зямлі, вады, чысціні паветра, але і чысціні чалавечых адносін...

Неўміручая камедыя М. Гогаля «Рэвізор» набыла жыццё на беларускай сцэне. Да класічнай рускай драматургіі звярнуўся Беларускі акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы. Пастаноўку спектакля ажыццявіў заслужаны дзеяч мастацтваў БССР В. РАЕЎСКІ, мастак— заслужаны дзеяч мастацтваў БССР Б. ГЕРЛАВАН, кампазітар—У. КАНДРУСЕВІЧ. Пераклаў п'есу на беларускую мову народны пісьменнік Беларусі К. КРАПІВА.

НА ЗДЫМКУ: сцэна са спектакля.

ГЛЫБОЦКІ ДЭНДРАРЫЙ

У Глыбокае мяне прывяла цяга да падарожжаў. Справіўшыся ў суседніх Докшыцах з уласнымі справамі, рашыў паглядзець на старажытны беларускі горад. Пахадзіў па яго ціхіх вуліцах, палюбаваўся помнікамі архітэктуры. Зайшоў у райком партыі. Сакратар яго, Эдуарда Анкуд, пацікавілася ўражаннямі, а потым пытаецца:

— А дэндрарый наш ужо бачылі?

— Дэндрарый... у Глыбокім?

— Так,—усміхнулася яна, — самы сапраўдны. Магу быць гідам.

Мінулі гарадскую ўскраіну, праехалі некалькі кіламетраў —і наша машына павярнула ўправа, пад кроны высокіх ліп і клёнаў. А за імі аказалася царства экзотаў.

Уражанне такое, нібы апынуўся ў паўднёвым—крымскім ці каўказскім батанічным садзе, а не на поўначы Беларусі, дзе нават дуб не хоча расці. І закладзены дэндрарый па ўсіх правілах, і месца для яго выбрана надзвычай удала. Тут на параўнальна невялікай плошчы — восем з палавінай гектараў —нібы хто знарок сабраў характэрныя для гэтых мясцін элементы пейзажу: раўніны, узгоркі, нізінкі, лужкі. Астатняе дадалі людзі — прывезлі валуны, зрабілі азярцо...

Мы ішлі ціхімі сцежкамі між дзівосных дрэў і кустоў. Любаваліся імі, знаёміліся: каля кожнай расліны на шыльдачцы пазначана, адкуль яна родам, звесткі пра яе «характар».

...Каля ўваходу трапляеш у гай буйнаплодных арэхаў. Іх тут шэсць відаў. Асабліва ўражваюць магутнасцю дрэвы манчжурскага арэха: яны высокія, з тоўстымі галінамі, з якіх звісае доўгае лісце.

На пагорку — чаромхавы гаёк. Надзвычай прыгожая ўраджэнка далёкаўсходніх лясоў чаромха Маака. Лісце ў яе, як у чарэшні, ствол, як у бярозы, ягады чырвоныя ці чорныя.

Рабін — цэлая калекцыя: сібірская, цюрынгская, салодкаплодная, скандынаўская, японская матцумура... У кожнай свае асаблівасці, формы крон, пладоў. Яднае ж іх тое, што ў пладах утрымліваецца шмат караціну, вітаміну С.

Паўночны схіл пагорка аддадзены елкам. Побач з мясцовымі растуць канадская, калючая (таксама з Канады), карэйская, цянь-шаньская, шрэпка, чорная і іншыя. Паўднёвы схіл — уладанне хвоек: тут і веймутава, і чорная аўстрыйская, і Мурэя, і румелійская з Балкан...

Пра ўсе расліны дэндрарыя не раскажаш. Іх каля паўтысячы відаў. Хто ж сабраў іх у адно месца, хто стварыў гэты экзатычны куток сярод даволі суровых прыдзвінскіх лясоў?

— Заслуга, перш за ўсё, былога дырэктара лясгаса Віктара Ламакі, які ўжо год дзесяць на пенсіі,— сказала мая спадарожніца.

Эдуарда Фабіянаўна расказала пра В. Ламаку — надзіва адданага прыродзе чалавека, які ўсё жыццё прысвяціў таму, каб зрабіць зямлю прыгажэйшай і багацейшай.

Нарадзіўся Віктар Антонавіч каля Мінска. Закончыў лесатэхнічны інстытут. А потым працаваў на Глыбоччыне.

Вайна вельмі пашкодзіла лясы, трэба было аднаўляць іх. Ламака быў адзіным спецыялістам у акрузе, таму працаваў за батаніка, каморніка, глебазнаўцу, аграхіміка, праекціроўшчыка. Абследаваў усе лясы, дасканала вывучаў іх. Падбіраў народныя дрэвы, насенне якіх ішло на вырошчванне саджанцаў. Іх садзілі на высечках, на непрыгодных для сельскай гаспадаркі землях. А потым В. Ламака задумаў стварыць на абпаленай зямлі дэндрарый, своеасаблівую лабараторыю, у якой яму хацелася праверыць, ці змогуць расці на Віцебшчыне дрэвы іншых кантынентаў. І не толькі расці, але і даваць патомства.

Шмат сілы давялося патраціць, каб прызвычаіць да мясцовых умоў жыхара Карпат — бук. Прыжыліся і дубы, якія растуць на поўдні рэспублікі. Раней піхты ў гэтым краі не сустракаліся. Зараз у Глыбоцкім дэндрарыі іх ажно сем відаў.

— Каб канчаткова пераканацца, ці прыжывуцца ў нас заморскія навасёлы, трэба было іх усебакова выпрабаваць,— расказаў Віктар Антонавіч. — Хаця калекцыя дэндрарыя маладая, яе ўжо праэкзаменавалі маразы і засухі. Не ўсе перасяленцы перанеслі іх, але тое, што засталося, можна рэкамендаваць для пасадак.

У дэндрарый прыязджаюць вучоныя рэспублікі. Яго наведваюць вучні глыбоцкіх школ, турысты. Яны з задавальненнем і цікавасцю знаёмяцца з незвычайнай і багатай калекцыяй раслін з усяго свету.

М. ДЗЕЛЯНКОЎСКІ.



Цікавыя доследы вядуцца вучонымі ў Цэнтральным Батанічным садзе Акадэміі навук БССР.
НА ЗДЫМКУ: старшы лабарант Таццяна СІНІЦЫНА ў аранжарэі кактусаў.
Фота Ю. ЗАХАРАВА.

МСЦІСЛАЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.).

Знойдзена некалькі пахаванняў па хрысціянскаму звычаю — галовамі на паўднёвы захад. У старажытны час могілкі размяшчаліся звычайна каля царквы, таму археолагі спадзяюцца знайсці гэтую царкву. Пры раскопках трапляюцца кавалкі плінфаў — вузкія, прадаўгаватыя цагліны, з якіх узводзіліся муры цэркваў.

Рэчы, што знаходзяць археолагі пры раскопках Замкавай гары, даюць нам уяўленне аб тым, як жыло насельніцтва Мсціслава. Яно займалася скураным, шавецкім, косцерэзным і іншымі рамёствамі. Пад падлогай зруба XIII стагоддзя знойдзена шэсць унікальных касцяных пласцін, якімі абкладалі калчаны для стрэл. На пласцінах — арнамент тонкага ўзору, сведчанне таго, што майстры гэтай разьбы былі добра знаёмы з заходнееўрапейскім мастацтвам, а таксама з арнаментамі палавецкіх калчанаў.

Знойдзена шмат кавалкаў скуры, асколкі бакала з арабскім надпісам, грэбень з самшыту. Адшуканыя рэчы характарызуюць стан гандлю таго часу. Напрыклад, крыжы-складні прывезены з Кіева, вырабы з самшыту — з Каўказа, бурштын — з Прыбалтыкі. Ракавіны трапілі сюды з Індыйскага акіяна.

Раскопкі даюць падрабязную характарыстыку і стану сельскай гаспадаркі таго часу. У старажытным Мсціславе вырошчвалі пшаніцу і жыта, карысталіся сохамі з жалезнымі сашнікамі і сярпамі. І вельмі многа было ручных жорнаў для размолу зерня.

22 ліпеня 1654 года войскі князя Трубяцкога зруйнавалі і спалілі Мсціслаўскую цытадэль. З таго часу горад на Замкавай гары не ўзнаўляўся. Па раскопках можна ўявіць стан вайсковай справы ў старажытным Мсціславе. Пад сучасным напластаваннем зямлі залягае магутны пласт разбурэнняў 1654 года, насычаны асколкамі чыгунных ядраў. А ў больш ніжэйшых пластах (XII—XIII стагоддзі) знойдзены лук, калчаны, арбалеты, наканечнікі для стрэл.

У 1858 годзе страшэнны пажар знішчыў многія старажытныя помнікі: Афанасьеўскую царкву, драўляны палац Кацярыны II, дамініканскі касцёл. Захаваліся касцёл кармелітаў і езуіцкі кляштар...

Каля Замкавай гары размешчаны самы выдатны архітэктурны помнік Мсціслава — Успенскі касцёл кармелітаў. Ён самотна ўзвышаецца над глыбокімі равамі. Усё нясе адбітак суровай вытанчанасці. Лацінскі надпіс на ім паведамляе, што касцёл пабудаваны ў XVII і рэстаўрыраваны ў XIX стагоддзі.

Цяпер Успенскі сабор зноў рэстаўрыруецца. У ім будзе знаходзіцца карцінная галерэя — філіял Дзяржаўнага мастацкага музея БССР.



У пачатку XVI стагоддзя езуіты пабудавалі ў горадзе кляштар з вялікім касцёлам святога Міколы, калегіум, школу, аптэку і інш. У XIX стагоддзі кляштар ператварыўся ў кафедральны сабор. У будынку езуіцкай калегіі было размешчана духоўнае вучылішча, а ў аптэцы — царква Мсціслаўскай гімназіі.

Побач з ансамблем былога езуіцкага кляштара ў 1907 — 1908 гадах была пабудавана мужчынская гімназія. Пасля Вялікага Кастрычніка тут адкрылася педагагічнае вучылішча, студэнтам якога быў і выдатны беларускі паэт Аркадзь Куляшоў. Цяпер у былой мужчынскай гімназіі размешчана сярэдняя школа № 1.

У пачатку XIX стагоддзя ўзніклі ў горадзе гандлёвыя рады. Яны займалі цэнтральную частку горада і амаль поўнасцю захаваліся.

Хоць і багатая гісторыя Мсціслава, які быў самым вялікім па плошчы горадам Магілёўскай губерні, аднак ён не меў сапраўднага гарадскога выгляду. У 1914 годзе тут налічвалася 1 084 жылыя пабудовы, з якіх толькі 95 былі цаглянымі. У горадзе не было ніводнай установы культуры. Затое па колькасці пітных устаноў Мсціслаў займаў пасля Магілёва другое месца ў губерні.

Новае аблічча Мсціслаў стаў набываць пасля Вялікага Кастрычніка і асабліва пасля Вялікай Айчыннай вайны. Побач з помнікамі старажытнасці ў адзіныя архітэктурныя ансамблі ўпісваюцца новыя пабудовы і комплексы. У розных месцах горада ўзводзяцца шматпавярховыя жылыя дамы. Амаль поўнасцю забудаваны сучаснымі будынкамі вуліцы Леніна, Пралетарская, Кірава.

Непазнавальным стаў цэнтр горада. Тут працуе Дом культуры, кінатэатр «Мір», гандлёвыя ўстановы.

Адсутнасць буйной прамысловасці, цішыня, чыстае паветра, маляўнічая ўзгоркавая мясцовасць, празрыстыя воды Віхры і Сожа ў спалучэнні з мноствам сведкаў розных гістарычных падзей і помнікаў старажытнасці ўжо цяпер прыцягваюць турыстаў з усяго Савецкага Саюза. Дарэчы, нядаўна гэты горад уключаны ў рэспубліканскі турысцкі маршрут.

У 1985 годзе Мсціслаў будзе адзначаць сваё 850-годдзе. Да гэтай даты рыхтуюцца ўсе жыхары старажытнага горада.

Мікола АНЮКОЎ.



НА ЗДЫМКАХ: на ўскраіне Мсціслава; вучні сярэдняй школы вывучаюць гісторыю свайго горада.
Фота Ю. ІВАНОВА.

САМАЕ ГЛЫБОКАЕ— ВОЗЕРА ДОЎГАЕ

Многа ў гэтым краі азёр — вялікіх і малых. Возера Доўгае, што на тэрыторыі саўгаса «Яблынька» Глыбоцкага раёна, нічым не быта ад іх не адрозніваецца.

І ўсё ж гэта возера — своеасаблівы рэкардсмен беларускай прыроды. Рэкардсмен па глыбіні. Дакладныя прамеры паказалі, што яго глыбіня — 53,7 метра. У гэтым сэнсе яму ўступаюць і Нарач, і Блакітныя мядзельскія азёры.

Усякая рыба водзіцца ў Доўгім: плотка, шчупак, акунь, язь, лінь, ленч, карась, налім, але підзе ў іншым месцы не сустрэнеш такой унікальнай рыбы, як стынка. Яна насяляе гэтае возера з часоў лёдавага перыяду, калі і ўтварылася Доўгае. Амаль празрыстая, стынка ненадоўга і толькі двойчы па год падымаецца на паверхню, жыве ў цемнай азёрнай глыбіні.

Улічваючы унікальнасць возера Доўгага, яго аб'явілі дзяржаўным заказнікам.

Гумар

— Скажы, П'ер, хто быў бацькам Людовіка Шаснаццатага?

— Людовік Пятнаццаты.

— А хто быў бацькам Карла Сёмага?

— Карл Шосты.

— Усё гэта добра, але хто ж тады бацька Францыска Першага?

— Францыск быў сіратой.

— Ты зноў з'ела ўсе цукеркі, Мішэль? Ведаеш, што табе за гэта будзе?

— Я не хачу ведаць, мама, ты ж сама гаварыла, што дзеці не павінны быць цікаўнымі.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

НАШ АДРАС:

МІНСК-ГСП, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44.
ТЭЛЕФОНЫ: 33-01-97, 33-02-80; 33-03-15, 33-16-56, 33-07-82.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Зак. 1168